**Эмблема Міністэрства замежных спраў**

Эмблема Міністэрства замежных спраў уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, якi падзелены ўздоўж бакоў палоскамі белага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты шэрага колеру.

Усе элементы крыжа абрамлены кантам белага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь белага колеру.

Крыж размешчаны на крузе сіняга колеру з аблямоўкай белага колеру, на якой размешчаны надпісы сіняга колеру: уверсе – ”РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ“, унізе – ”МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ“. Паміж надпісамі – кропкі сіняга колеру.

Прамы роўнаканцовы клінчата-вырубны крыж у сваёй ізаграфіі аналагічны ўзору беларускага арнаменту - крыжа «Васьмірог» («беларуская зорка»), які азначае паняцце «Чалавек-Жыццё», што сугучна ідэалогіі беларускай дзяржавы ў кантэксце эмблемы: «Годнае Жыццё Чалавека ў годнай Краіне». У цэнтры эмблемы – Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь.

Узор беларускага арнаменту мае тысячагадовую гісторыю, што падкрэслівае старажытную культуру і багатую гісторыю беларусаў, іх самасвядомасць і ўпэўненасць у сваім гістарычным выбары. Чырвоны, зялёны і белы колеры тоесныя колерам Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Шэры, белы і чырвоны колеры сугучныя народнай культуры беларусаў – колеру лёну, палатна, вышыўкі нацыянальных касцюмаў.